**УДК 94(438)**

# ПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ТРАЯНА КОРСАКА БАБЫНІЦКАГА Ў ПАНАВАННЕ АЎГУСТА III І СТАНІСЛАВА АЎГУСТА ПАНЯТОЎСКАГА

***канд. гіст. навук А. МАЦУК***
**Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск**

*Адзначаецца, што Траян Корсак Бабыніцкі пакінуў значны ўнёсак у гісторыю Полачыны. Ён зрабіў выдатную кар'еру і з 1749 г. займаў ключавыя ўрады для Полацкага ваяводства: полацкага гродскага сурагатара і полацкага падваяводы. Траяну Корсаку Бабыніцкаму ўдалося аб'яднаць у сваіх руках усе спадчынныя ўладанні. Падкрэсліваецца, што паспяховай была і яго грамадска-палітычная дзейнасць – з сярэдзіны 40-х гг. XVIII ст. Траян Корсак Бабыніцкі ўзначальваў шляхецкую групоўку Корсакаў.*

Траян Корсак Бабыніцкі пакінуў значны след у жыцці Полацкага ваяводства XVIII ст. Ён шмат гадоў узначальваў мясцовую адміністрацыю. Праславіўся і сваёй актыўнай дзейнасцю на полацкіх сойміках, дзе дзейнічаў у інтарэсах свайго роду. Гэта былі складаныя часы для ВКЛ, якія скончыліся падзеламі Рэчы Паспалітай. У гэты час Траян Корсак Бабыніцкі паказаў сябе як дастаткова здольны палітык, які ўтрымаў адзінства рода Корсакаў і ўмацаваў іх пазіцыі сярод шляхты Полацкага ваяводства.

Траян Корсак Бабыніцкі нарадзіўся ў Дзярновічах 11 красавіка 1720 г. у сям'і полацкага харужага Аляксандра Канстанціна і яго жонкі Кацярыны з Козелаў Паклеўскіх. Ужо 29 красавіка 1720 г. ён быў ахрышчаны ў парафіяльным касцёле ў Дзярновічах [1, s. 186; 2, s.367]. Калі прыняць за сапраўдныя гэтыя дату нараджэння і хрышчэння Траяна Корсака Бабыніцкага, то акажыцца, што сваю грамадска-палітычную дзейнасць пачаў ва ўзросце ўжо 13 год, калі накіраваўся на элекцыйны сойм Рэчы Паспалітай 1733 г. Разам з бацькай і братам Фабіянам ён быў сярод тых шляхціцаў, якія 14 верасня 1733 г. падпісалі маніфест супраць выбара каралём Станіслава I Ляшчынскага [3, k.345–346].

Аднак, як можна меркаваць, знаходжанне Траяна Корсака Бабыніцкага сярод праціўнікаў Станіслава I Ляшчынскага было нядоўгім. Ужо ў пачатку 1734 г. ён услед за сваім бацькам аказаўся сярод прыхільнікаў Ляшчынскага. Магчыма з-за нежадання бацькі ўмешваць сыноў у міжусобную вайну ці з-за занадта маладога ўзросту, але няма ніякай інфармацыі пра ўдзел Траяна Корсака Бабыніцкага ў баявых дзеяннях падчас бескаралеўя 1733–1735 гг. Таксама нічога невядома і пра яго ўдзел у канфедэрацыях і сойміках Полацкага ваяводства гэтага часу.

Пасля смерці бацькі (канец жніўня – пачатак верасня 1735 г.) Траян Корсак Бабыніцкі знаходзіўся ў цяні брата Фабіяна. Браты актыўна ўдзельнічалі ў грамадска-палітычнай барацьбе ў Полацкім ваяводстве. Як і бацька, яны далучыліся да шляхецкай групоўкі Корсакаў і працягвалі канфлікт іх бацькі з Антоніям і Казімірам Буйніцкімі. Разам з іншымі ўдзельнікамі групоўкі Корсакаў (Сымонам, Янам і Пятром Корсакамі Удзельскімі) падгаварылі Юзафа Корсака Залескага на чале нанятых расійскіх жаўнераў напасць на дзяржаўныя маёнткі, якія трымалі Буйніцкія. 20 лістапала 1735 г. Юзаф Корсак За-лескі напаў на Крашуты Антонія Буйніцкага, а 8 красавіка 1736 г. на Чарніцу Казіміра Буйніцкага [4, с.108]. У адказ Казімір Буйніцкі распачаў судовую справу супраць Фабіяна, Траяна і Андрэя Корсакаў Бабыніцкіх у полацкім сурагатарскім суддзе [5, арк. 655-655адв, 718-718адв, 927-928адв, 1133-1133адв]. Яшчэ адной прычынай, акрамя палітычных разлікаў, падтрымкі Траянам і Фабіянам Корсакамі Бабы-ніцкімі напэўна была дамова з красавіка 1735 г. Юзафа Корсака Залескага з іх памёршым бацькам, полац-кім харужым, Аляксандрам Канстанцінам Корсакам Бабыніцкім. Згодна гэтай дамовы, за 2000 злотых Юзаф Корсак Залескі прадаваў сваё ўладанне Маркоўшчына (Сяляўшчына), якое раней належыла да Дзярновіч і Сакалішча, уласнасці як раз Корсакаў Бабыніцкіх. Іншая справа, што дакументы на Мар-коўшчыну (Сяляўшчыну) засталіся ў апекуноў Юзафа Корсака Залескага Буйніцкіх. Таму Юзаф Корсак Залескі перадаваў свае правы забраць гэтыя дакументы Аляксандру Корсаку Бабыніцкаму [6, p. 5-6].

Безумоўна, Траян і Фабіян з-за маладога ўзросту не маглі быць лідарамі групоўкі Корсакаў, якая дзейнічала ў Полацкім ваяводстве. На яе чале аказваюцца больш уплывовыя прадстаўнікі рода – полацкі гараднічы Базылі Корсак Бабыніцкі і полацкі войскі Сымон Корсак Удзельскі, а таксама іх саюзнік полацкі кашталян Валяр'ян Жаба. Разам з братам Фабіянам праявіў сябе Траян Корсак Бабыніцкі падчас полацкага грамнічнага сойміка 1737 г. Яны разам з іншымі прадстаўнікамі рода Корсакаў (сярод іх былі, як Корсакі Залескія, так і Корсакі Удзельскія) падчас сойміка пасяклі шляхціцаў Юзафа Лісоўскага і Стэфана Вырпшу [7, p. 627-627v; 8, p. 5-5v; 9, арк. 195-198]. Аднак гэта ўсё на што хапіла моцы Корсакаў супраць апанентаў, якія хоць і з пратэстамі пад дырэкцыяй чашніка ВКЛ Юзафа Шчыта абралі дэпутатамі дудзскага старосціча Яна Буйніцкага і полацкага гараднічыца Адама Шчыта [10, k.7-8]. Больш таго, калі пасля сойміка Фабіян і Траян Корсакі Бабыніцкія вярталіся да дому ў Дзярновічы, то на іх

напалі слугі Юзафа Шчыта. Яны пагражалі забіць полацкіх харужыцаў і тым ледзьве ўдалося пазбегнуць узброенай бойкі [11, арк. 205-206].

Магчыма такая лакальная няўдача падчас полацкага грамнічнага сойміка 1737 г. прымусіла Корсакаў пераглядзець ранейшыя шляхецкія саюзы ў Полацкім ваяводстве. Другой прычынай стала жаніцьба іх палітычнага саюзніка Міхала Сяліцкага на Элеаноры з Буйніцкіх. Трэцяй – смерць аднаго з лідараў праціўнікаў полацкага падчашага і полацкага гродскага сурагатара Антонія Буйніцкага. У выніку склаўся саюз Шчытоў, Буйніцкіх, Сяліцкіх з Корсакамі. Юзаф Лісоўскі, якога пасяклі падчас грамнічнага сойміка 1737 г., зняў усе абвінавачванні супраць полацкага войскага Яна, старадубскага стольніка Пятра і полацкага лоўчыца Тадэвуша Корсакаў Удзельскіх, а таксама Фабіяна і Траяна Корсакаў Бабыніцкіх. Аднак пакінуў іх супраць Юзафа Корсака Залескага [8, р. 5-5v]. У адрозненні ад брата Фабіяна, Траян Корсак Бабыніцкі не падпісаў пратэсту супраць выбару на полацкім гаспадарчым сойміку 1738 г. паслоў да караля па ўніверсал для выбара полацкага ваяводства. На падставе гэтага можна меркаваць, што ён з невядомых прычынаў адсутнічаў на гэтым сойміку. Увогуле полацкія грамнічны і гаспадарчы соймікі 1738 г. пераканаўча паказалі перамены ў саюзах паміж полацкай шляхтай. Міхал Сяліцкі разам з Корсакамі Бабыніцкімі выступалі супраць Корсакаў Удзельскіх і Гласкаў. Фактычна гэтыя соймікі паказалі распад групоўкі Корсакаў. Безумоўна значная роль у гэтых пераменах належыла Фабіяну і Траяну Корсаку Бабыніцкім, якія вырашылі супрацоўнічаць з Міхалам Сяліцкім і яго новымі родзічамі Буйніцкімі супраць Корсакаў Удзельскіх.

Перад полацкім пасольскім соймікам 1738 г. (у ноч з 26 на 27) Траян Корсак зноў вылучыўся ўдзелам у бойцы. Гэтым разам з сваімі сябрамі Янам, Пятром і Станіславам Корсакамі ў групоўцы шляхты на чале з вайпунскім старостай Міхалам Сяліцкім яны моцна збілі і аграбілі шляхціцаў Яна Рудзевіча і Яна Караля Палубінскага [12, арк. 245-246адв]. Неабходна таксама заўважыць, што менавіта гэты дакумент зафіксіраваў першы раз дзейнасць у шэрагах адной групоўкі Траяна Корсака Бабыніцкага з Янам, Станіславам і Стэфанам Корсакамі. Гэтае супрацоўніцтва фактычна пратрывала да канца жыцця Траяна Корсака Бабыніцкага і садзейнічала яго ўмацаванню як аднаго з лідараў групоўкі Корсакаў.

Сам пасольскі соймік 1738 г. з пратэстамі скончыўся перамогай новай кааліцыі родаў Сяліцкіх, Буйніцкіх, Корсакаў Бабыніцкіх і Корсакаў Удзельскіх, якія разарвалі саюз з Гласкамі і далучыліся да гэтай кааліцыі. У пратэстах Гласкаў і Юзафа Корсака Залескага супраць сойміка галоўная віна ўскладалася на Корсакаў Удзельскіх, Міхала Сяліцкага, Яна Буйніцкага і полацкага гараднічага Базыля Корсака Бабыніцкага [13, с. 104–105]. Як можна меркаваць, супраць Гласкаў на сойміку выступалі і браты Фабіян і Траян Корсак Бабыніцкі, але яны не знаходзіліся сярод лідараў гэтай кааліцыі і таму не ўпаміналіся ў гэтай пратэстацыі, але знаходзіліся ў яе шэрагах.

Полацкі грамнічны соймік 1739 г. быў сарваны з-за супрацьстаяння тых жа шляхецкіх кааліцый. На гаспадарчым сойміку перавагу атрымалі праціўнікі кааліцыі Сяліцкіх, Буйніцкіх, Корсакаў Бабыніцкіх і Корсакаў Удзельскіх, і дырэктарам быў абраны полацкі земскі суддзя Траян Гласко, але потым соймік быў сарваны часткай мясцовай шляхты на чале з Фабіянам і Траянам Корсакамі Бабыніцкімі, Янам Буйніцкім, Міхалам Сяліцкім і полацкімі войскім Янам, старадубскім стольнікам Пятром, ладаснянскім старостай Геранімам Корсакамі Удзельскімі, Янам, Станіславам і Стэфанам Корсакамі. Пазней Траян Корсак Бабыніцкі і яго саюзнікі сабраліся на новы соймік і абралі яго дырэктарам Марцэлія Байкоўскага і вызначылі паслоў Пятра Корсака Удзельскага і Міхала Сяліцкага да караля па ўніверсал на скліканне сойміка для выбара полацкага ваяводы [14, арк. 594-595адв]. Як бачна ўжо ў пратэсце Гласкаў і іх саюзнікаў супраць полацкага гаспадарчага сойміка 1739 г., аднымі з лідараў супрацьстаячай шляхецкай кааліцыі называюцца Фабіян і Траян Корсакі Бабыніцкія. Звяртае ўвагу, што зноў Траян Корсак Бабыніцкі дзейнічаў разам са сваімі родзічамі Янам, Станіславам і Стэфанам Корсакамі.

Дакладна невядома, калі Траян Корсак Бабыніцкі разам з старэйшым братам Фабіянам пачаў супрацоўнічаць з магнацкай групоўкай Сапегаў. Згодна захаваўшымся рахункам Сапегі выдзялялі на полацкі соймік у 1740–1742 гг. грошы Корсаку: 1740 г. гэта было 480 злотых, у 1741 г. – 400 злотых, а ў 1742 г. – 320 злотых [13, с. 157; 15]. Далейшыя падзеі паказалі, што з Сапегамі былі звязаны браты Фабіян і Траян Корсакі Бабыніцкія. Таму можна меркаваць, што пад гэтым Корсакам, напэўна, разумеўся адзін з братоў. Як раз у гэты час у ВКЛ разгарнулася барацьба паміж Радзівіламі і Сапегамі. Такім чынам, Траян Корсак Бабыніцкі разам з братам Фабіянам у гэтым змаганні выбралі бок Сапегаў. Гэта парушыла іх супрацоўніцтва ў Полацкім ваяводстве з уплывовым вайпунскім старостай Міхалам Сяліцкім, які ў канфлікце магнацкіх груповак у Княстве абраў бок Радзівілаў.

Уплывы Траяна і Фабіяна Корсакаў Бабыніцкіх у Полацкім ваяводстве ў гэты час узраслі. Гэта дазваляе прасачыць дакумент “Апазіцыя супраць канкурэнцыі літоўскага абозная Агінскага аб полацкае ваяводства”, які адносіцца да 1742 г. [16, с.120–128]. Мэтай дакумента было ўстанавіць наколькі магчыма правесці выбары Ігната Агінскага полацкім ваяводай. Галоўныя перашкоды выбару Агінскага маглі зыходзіць з боку мсціслаўскага кашталяна Юзафа Шчыта і полацкага гродскага сурагатара Антонія Яна

Корсака Залескага. Моц апошняга як раз і грунтавалася на супрацоўніцтве з Фабіянам і Траянам Корсакамі Бабыніцкімі, якія непрыхільна адносіліся да Агінскіх [17, s. 25-27v]. У такой сітуацыі, для абрання полацкім ваяводай Ігната Агінскага, лічылася неабходным перацягнуць на свой бок полацкіх харужыцаў Корсакаў, паабяцаўшы ім полацкія ўрады, у першую чаргу гродскія ўрады [17, s. 26v]. Як бачым з гэтага дакумента, браты Фабіян і Траян Корсакі Бабыніцкія дзейнічалі разам з полацкім гродскім сурагатарам і полацкім стольнікам Антоніям Янам Корсакам Залескім. Яны разам з ім складалі адну з галоўных шляхецкіх груповак, якія мелі ўплыў на палітычную сітуацыю ў Полацкім ваяводстве. Недахопам іх становішча сярод полацкай шляхты як раз была адсутнасць у іх урадаў.

Нягледзячы на гэта, браты працягвалі ўзмацняць свае пазіцыі. Фабіян Корсак Бабыніцкі быў абраны дэпутатам на полацкім грамнічным сойміку 1743 г. На наступным грамнічным сойміку 1744 г. ён быў абраны яго дырэктарам. На наступны дзень на полацкім гаспадарчым сойміку 1744 г., дзе Фабіян заставаўся соймікавым дырэктарам, былі абраны паслы з просьбай правесці выбар полацкага ваяводы. Адным з гэтых паслоў быў абраны Траян Корсак Бабыніцкі. Ужо 17 лістапада 1744 г. Траян Корсак Бабыніцкі і Міхал Сяліцкі атрымалі ў Варшаве аўдыенцыю ў караля Аўгуста III, дзе прасілі выдаць універсал на выбары полацкага ваяводы, што кароль і зрабіў 22 лістапада 1744 г. [13, с. 107–108; 18, л. 39об]. У гэты час надыйшлі і доўгачаканыя ўрады. 8 верасня 1744 г., пасля смерці Яна Корсака Удзельскага, урад войскага атрымаў полацкі харужыц Фабіян Корсак Бабыніцкі. Гэта прывяло братоў да канфлікту з Корсакамі Удзельскімі, якія не дапусцілі Фабіяна заняць месца войскага на грамнічным сойміку 1745 г. Бацька памершага Яна Корсака Удзельскага Сымон на падставе свайго старога прывілея сцвярджаў, што гэта ён застаецца полацкім войскім. Дапамогу яму аказаў уплывовы полацкі гараднічы Базыль Корсак Бабыніцкі. Моцы Фабіяна і Траяна Корсакаў Бабыніцкіх не хапала, каб перамагчы такую моцную кааліцыю. Адзіным выйсцем было шукаць справядлівасці ў судзе. Фабіян Корсак Быбыніцкі звярнуўся ў асэсарскі суд, што прымусіла Сымона Корсака Удзельскага шукаць згоды. 10 студзеня 1747 г. ён адмовіўся ад сваіх прэтэнзій і прызнаў легітымным войскім Фабіяна Корсака Бабыніцкага [13, с. 153; 19, арк. 686-687; 20, арк. 76-77адв]. Узвышэнне ва ўрадніцкай іерархіі брата садзейнічала і ўзмацненню пазіцыі Траяна Корсака Бабыніцкага.

Траян Корсак Бабыніцкі быў на полацкім грамнічным сойміку 1746 г. і падпісаў крэдэнс абраным на ім дэпутатам інфлянцкаму падчашаму Андрэю Сакалоўскаму і інфлянцкаму скарбніку Яну Свалынскаму і крэдэнс полацкім францішканам, які зацвярджаў рашэнне аб грашовых выдатках ім полацкай шляхты [19, арк. 94адв, 635]. На наступным полацкім грамнічным сойміку 1747 г. дайшло да канфлікту Фабіяна і Траяна Корсакаў Бабыніцкіх з шляхціцамі Рэвутам і Мяніцкім. У бойцы яны паранілі Рэвута [21, арк. 154-155адв, 233-234адв, 798-799адв].

Безумоўна, што Траян Корсак Бабыніцкі ўслед за братам таксама імкнуўся атрымаць які-небудзь урад. Садзейнічалі гэтаму і іх магнацкія патроны Сапегі. Ужо ў 1747 г. Міхал Антоні Сапега, атрымаўшы звесткі пра смерць полацкага стольніка, прасіў гэты ўрад для полацкага харужыца Траяна Корсака Бабыніцкага [22, k. 57]. Аднак гэты ўрад дастаўся полацкаму гродскаму сурагатару Антонію Яну Корсаку Залескаму. У сваю чаргу пасля смерці ў 1748 Антонія Яна Корсака Залескага аказаліся вольнымі ўрады полацкага гродскага сурагатара і полацкага стольніка. Самая сур'ёзная барацьба разгарнулася за ключавы ў адсутнасць ваяводы ўрад гродскага сурагатара. Сярод канкурэнтаў быў і Траян Корсак Бабыніцкі. Вырашальнай для яго перамогі ў барацьбе з іншымі канкурэнтамі была дапамога Яна Дамініка Лапацінскага, які пераканаў на яго карысць падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага. Падканцлер ВКЛ у сітуацыі далучэння да Фаміліі магнацкай групоўкі Сапегаў пагадзіўся надаць гэты ключавы ўрад у Полацкім ваяводстве сапежынскаму прыхільніку Траяну Корсаку Бабыніцкаму. Гэта і адбылося 1 лютага 1749 г. [23, p. 178v, 182v]. Уплывы Траяна Корсака Бабыніцкага былі пацверджаны абраннем яго 4 лютага 1749 г. полацкім ротмістрам на полацкім грамнічным сойміку [18, л. 40].

Яшчэ ў 1741 г. брат Андрэй, які стаў манахам-базыльянінам, зрокся сваіх правоў да ўладанняў Дзярновічы, Уланаў і Зарэмбкаў на карысць Фабіяна і Траяна Корсакаў Бабыніцкіх. 3 мая 1747 г. адбыўся падзел маёнткаў паміж братамі Фабіянам і Траянам. У выніку Траяну Корсаку Бабыніцкаму дасталося галоўнае ўладанне Дзярновічы, а Фабіяну два іншых: Уланаў і Зарэмбкаў [18, л. 1].

У гэты час Траян Корсак Бабыніцкі разам з іншымі прадстаўнікамі рода Корсакаў у Полацкім ваяводстве моцна канфліктаваў з родам Снарскіх. Разам з ім супраць Снарскіх выступілі Юзаф, полацкі ротмістр Людвік, Гіляры, Ян, Аляксандр і Пётр Корсакі. У верасні 1749 г. Корсакі напалі на ўладанне Снарскіх Мілонкі. Больш таго схапілі на дарозе Казіміра Снарскага і завезлі да маёнтка Аляксандра Корсака, дзе з ім "розныя здзекі рабілі, біўшы, голадам марыўшы". Потым Аляксандр, Гіляры, Ян і Пётр Корсак, даведаўшыся пра дэпазіт Антонія Снарскага у полацкага бурмістра, напалі на яго дом і захапілі грошы і рэчы Снарскіх. 13 лістапада 1749 г. у Полацку Корсакі напалі на лагер Казіміра Снарскага. Падчас гэтых боек загінула некалькі прыхільнікаў Снарскіх. У 1751 г. Корсакі напалі ў Полацку на Аўгустына Снарскага і моцна яго збілі, што той ледзьве не памёр. Траян Корсак Бабыніцкі абвінаваціў



Polotsk.su

Антонія Снарскага ў гвалце над мяшчанкай. У сваю чаргу Антоній Снарскі заявіў аб фабрыкацыі Корсакамі гэтай судовай справы, каб адпомсціць яму [24, р. 761-767; 25, р. 2477-2478v].

Канфлікт Корсакаў з Снарскімі моцна адбіўся на функцыяніраванні полацкіх соймікаў. На полацкім грамнічным сойміку 1749 г. нечакана перамаглі Снарскія і іх прыхільнікі, дэпутатамі былі абраны Антоній Снарскі і Габрыэль Медунецкі. Полацкі грамнічны соймік 1750 г. пачаўся з узброенай бойкі Снарскіх з Корсакамі. Ініцыятарамі былі Корсакі. Супраць дзеянняў Корсакаў была занесена пратэстацыя. На другі дзень ужо ніхто не рызыкнуў перашкаджаць выбару дэпутатаў, бо адным з іх быў Траян Корсак Бабыніцкі. Пакаша дапусцілі да выбара дэпутатам толькі пасля яго абяцання дзейнічаць у згодзе з Траянам Корсакам Бабыніцкім, Снарскім удалося толькі занесці пратэстацыю супраць сойміка [13, с. 111; 26, k. 9-10; 27, k. 95]. У 1751 г. радзівілаўскія прыхільнікі Снарскія збіралі шляхту для зрыва сойміка [27, k. 135]. У выніку полацкі грамнічны соймік у 1751 г. быў сарваны радзівілаўскімі прыхільнікамі, якія не хацелі дапусціць выбару непрыхільных Радзівілам дэпутатаў [28, k. 62; 29, k. 1-2]. Узмацніла канфлікт з Снарскімі і зацікаўленасць Траяна Корсака Бабыніцкага іх справай з Стрэнкоўскай. Ён для выканання судовага рашэння ў інтарэсе Стрэнкоўскай звярнуўся да падскарбія ВКЛ і аднаго з лідараў Фаміліі Юрыя Флемінга з просьбай даць людзей з Полацкай эканоміі. Той у сваім лісце ад 22 снежня 1751 г. даў людзей для выгнання Снарскіх з захопленных уладанняў Стрэнкоўскай і прасіў кантактваць у гэтай спарве з крашуцкім старостай Янам Буйніцкім [30, арк. 13-14адв].

У гэты час адбыліся перамены ў асабістым жыцці Траяна Корсака Бабыніцкага. У студзені 1750 г. адбылася яго жаніцьба на ясвонскай старасцянцы Тэрэзе Агінскай. Апекуном якой быў троцкі кашталян Тадэвуш Агінскі і лічылася, што з гэтага часу Траян Корсак Бабыніцкі будзе абавязаны дзейнічаць у супрацоўніцтве з магнацкім родам Агінскіх [26, k. 9-10]. Аднак гэтага не адбылося. Больш таго, Траян Корсак Бабыніцкі моцна канфліктаваў за спадчыну па Яну Антонію Агінскаму з братамі Тэрэзы ясмонскім старостай Ігнатам і векшнянскім цівуном Міхалам. 20 ліпеня 1751 г. Траян Корсак Бабыніцкі, згодна правоў сваёй жонкі, заняў 10 службаў ва ўладанні Колпін. Агінскія спачатку пагадзіліся на гэта, але потым занялі гэтыя службы і не дапусцілі слуг Корсака Бабыніцкага збіраць падаткі і правізію з гэтых службаў. Справа расцягнулася на некалькі год, нягледзчы, што Траян Корсак Бабыніцкі атрымліваў на сваю карысць рашэнні Трыбунала ВКЛ. Міхал і Ігнат Агінскія не згадзіліся на такія рашэнні Трыбунала ВКЛ і не дапускалі заняцця Траянам Корсакам Бабыніцкім чацвёртай часткі сваіх уладанняў. Хітрыў і сам Траян Корсак Бабыніцкі. Калі дайшло да дамовы з Міхалам Агінскім, то аказалася, што полацкі падваявода хацеў аддаць з часткі Міхала Агінскага толькі тры далёкія ад Магільна вёскі, а замест іншых чатырох хацеў аддаць сем вёсак ад Колпіна. Безумоўна Агінскі не згадзіўся на такія невыгодныя ўмовы. Канчатковая дамова была заключана толькі ў канцы 50-х гг. XVIII ст. [31, р. 95-98].

У 1750 г. ажаніўся і старэйшы брат Траяна Корсака Бабыніцкага Фабіян. Яго абранніцай стала віцебская скарбнікаўна Кунегунда з Грабніцкіх. 6 мая 1750 г. Фабіян Корсак Бабыніцкі аддаў сваёй жонцы Кунегундзе з Грабніцкіх у заставу за 8 тысяч талераў, бітых на Ульянаве і Зарэмбкаве [32, р. 480-483]. 25 мая 1750 г. Фабіян і Кунегунда Корсакі зракліся ўсіх уладанняў спадчыны віцебскага скарбніка Грабніцкага [32, р. 470-473v]. 26 мая 1750 г. Фабіян Корсак Бабыніцкі запісаў жонцы пажыццёвае ўладанне Зарэмбкавам [32, р. 484-487]. 19 жніўня 1752 г. Фабіян Корсак Бабыніцкі нечакана памірае. Смерць брата аслабіла пазіцыі і Траяна Корсака Бабыніцкага сярод шляхты Полацкага ваяводства. Акрамя таго, уладанні брата аказаліся ў руках яго жонкі Кунегунды з Грабніцкіх. 19 кастрычніка 1752 г. у Трыбунале ВКЛ быў актыкаваны дакумент аб прыданні апецы Кунегундзе з Грабніцкіх Корсак. Апекунамі вызначаліся віленскі каад'ютар Юзаф Станіслаў Сапега, рэферэндарый ВКЛ Антоній Пшаздецкі і віленскі земскі пісар Андрэй Абрамовіч [33, р. 941-942v]. Безумоўна, што супраць такіх моцных апекуноў у Траяна Корсака Бабыніцкага не хапала сілаў.

У пачатку 50-х гг. XVIII ст. магнацкія роды актыўней распрацоўвалі планы па выбарах полацкага ваяводы. Сітуацыя ў самім Полацкім ваяводстве тым часам моцна пагоршылася. Не змену канфлікту Корсакаў са Снарскімі далучыўся канфлікт Корсакаў з шляхецкай групоўкай Грабніцкіх. Пасля смерці 19 жніўня 1752 г. полацкага войскага Фабіяна Корсака Бабыніцкага полацкі гродскі сурагатар імкнуўся вярнуць гэтыя родавыя ўладанні, што прывяло да канфлікту. У яго аказаліся ўцягнуты амаль усе вядучыя шляхецкія роды Полацкага ваяводства. Калі Корсакі ў асноўным абядноўвалі прадстаўнікоў розных галін іх рода (Корсакаў Бабыніцкіх, Корсакаў Удзельскіх і Корсакаў Галубіцкіх), то аснову шляхецкай групоўкі Грабніцкіх акрамя рода Грабніцкіх складалі Зяновічы і Буйніцкія. Пасля смерці Фабіяна Корсака Бабыніцкага Траян становіцца лідарам групоўкі Корсакаў. Перавагу мела групоўка Грабніцкіх, але моцы групоўкі Корсакаў хапала, каб заблакаваць любыя памкненні апанентаў па выбару полацкага ваяводы, паслоў і дэпутатаў. На чале групоўкі Корсакаў як раз і быў Траян Корсак Бабыніцкі. Як полацкі гродскі сурагатар ён не быў зацікаўлены ў выбары новага полацкага ваяводы. Аднак канкурэнтам на гэты ўрад выступіў Аляксандр Сапега і Траян Корсак Бабыніцкі стаў перад выбарам: парваць з Сапегамі не дапусціўшы выбара полацкім ваяводай Аляксандра Сапегі ці падтрымаць таго і шукаць узнагарод для сябе і свайго рода ў новага ваяводы. У выніку Траян Корсак Бабыніцкі перад выбарамі полацкага вая-

воды пераканаў усю групоўку Корсакаў падтрымаць кандыдатуру Аляксандра Сапегі. Хаця напэўна не перашкаджаць выбару полацкім ваяводай было прынята на агульнай нарадзе Корсакаў [34, p. 151-152v]. Добра разумелі значэнне Траяна Корсака Бабыніцкага для выбара полацкім ваяводай Аляксандра Сапегі і Сапегі. Менавіта таму як кампенсацыю за ўрад полацкага гродскага сурагатара яны прапанавалі яму ўрад полацкага падваяводы. Канкурэнтам на гэты ўрад падваяводы насуперак Траяна Корсака Бабыніцкага таксама быў Міхал Сяліцкі [35, p. 1v]. Ды і Грабніцкія не хацелі бачыць Траяна Корсака Бабыніцкага на ўрадзе полацкага падваяводы [34, p. 153]. Аднак Сапегі прымусілі ўсіх пагадзіцца, бо добра разумелі, што без Траяна Корсака Бабыніцкага немагчыма будзе правесці выбар полацкім ваяводай Аляксандра Сапегі. Акрамя таго, Сапегі былі вымушаны пагадзіцца зрабіць фінансавую кампенсацыю Грабніцкім у 7 тысяч злотых (4 тысячы з іх мелі выплаціць Сапегі), каб тыя адмовіліся на карысць Траяна Корсака Бабыніцкага ад усіх уладанняў памершага Фабіяна Корсака Бабыніцкага [13, с. 78]. Такім чынам, Сапегі ўгаварылі Грабніцкіх значна паменьшыць свае фінансавыя апетыты (тыя, праўда, не хацелі 8 тысяч талераў бітых, але спачатку планавалі атрымаць 10 тысяч злотых), а таксама выплацілі большасць агаворанай сумы. Траяну Корсаку Бабыніцкаму заставалася толькі выплаціць 3 тысячы злотых. 5 студзеня 1753 г. Кунегунда Корсак заявіла, што Траян Корсак Бабыніцкі пры “прыяцельскай медыяцыі” аддаў ёй 8 тысяч талераў бітых і яна зракалася ўсіх сваіх правоў на ўладанні Ульянаў і Зарэмбкаў [36, p. 4-5, 6-7]. У сваю чаргу, 7 студзеня 1753 г. Траян Корсак Бабыніцкі ўсё пры той жа “прыяцельскай медыяцыі” адмовіўся ад пачатых судовых спраў з Кунегундай [37, арк. 63-64адв].

Пасля разрыва Сапегаў з Фаміліяй у 1758 г. Траян Корсак Бабыніцкі застаўся прыхільнікам Сапегаў. Можна меркаваць, што выбар на карысць Сапегаў быў зроблены ў выніку больш даўніх і трывалых сувязяў з гэтым родам. Узмацняла сувязі з Сапегамі, што Траян Корсак Бабыніцкі быў падваяводай пры полацкім ваяводзе Аляксандры Сапезе. Акрамя таго, пераход Сапегаў у прыдворную партыю рабіў для Корсакаў больш верагодным атрыманне новых урадаў. Да таго ж на баку Чартарыйскіх выступілі даўнія апаненты Корсака ў Полацкім ваяводстве: полацкі войскі Антоній Зяновіч і полацкі стольнік Ян Буйніцкі. Больш таго, у канцы панавання Аўгуста III Траян Корсак Бабыніцкі ўсё больш актыўна пачынае супрацоўнічаць з саюзнікамі Сапегаў па прыдворнай партыі – магнацкай групоўкай Радзівілаў. Да гэтага яго цягнула частка крэўных на чале з полацкім скарбнікам Людвікам Корсакам Бабыніцкім. У сітуацыі абвастрэння барацьбы паміж шляхецкімі групоўкамі ў Полацкім ваяводстве моцы Траяна Корсака Бабыніцкага не хапала, каб выратоўваць полацкія соймікі ад срыва [13, с. 115-118, 203-207]. Увогуле ў гэты час полацкі падваявода пачаў шчыльна супрацоўнічаць з Радзівіламі. Калі ў ліпені 1762 г. Траян Корсак Бабыніцкі быў у Вільні, то з’явіліся чуткі, што ў яго ў доме хаваюцца радзівілаўскія прыхільнікі Ян Цеханавецкі і Горскі. Даслана жаўнераў, якія не знайшлі Цеханавецкага і Горскага, але арыштавалі двух слуг полацкага падваяводы [38, k. 2-3]. У інтарэсе Радзівілаў Траян Корсак Бабыніцкі дзейнічаў і на сойміках у Полацку. Актыўна стараўся, каб згодна просьбе Радзівілаў, дэпутатам на полацкім грамнічным сойміку 1762 г. быў абраны полацкі падстолі Канстанцін Свалынскі. Аднак гэты соймік быў сарваны [38, k. 1]. З радасцю інфармаваў віленскага ваяводу Караля Станіслава Радзівіла пра выбар прыхільных дэпутатаў на полацкім грамнічным сойміку 1763 г. полацкага ротмістра Гілярыя Корсака Бабыніцкага і Сымона Тадэвуша Абрампальскага [38, k. 4-5].

Смерць Аўгуста III прынесла значныя перамены ў Полацкім ваяводстве. Прычынай быў пераход на бок Фаміліі польнага гетмана ВКЛ і полацкага ваяводы Аляксандра Сапегі з-за сваркі з віленскім ваяводай Каралем Станіславам Радзівілам. У выніку на полацкім перадканвакацыйным сойміку 1764 г. пасламі былі абраны два прыхільныя Фаміліі паслы каралеўскі шамбелян Юзаф Храпавіцкі і хлявінскі староста Юзаф Сяліцкі. Маршалкам каптуровага суда быў абраны полацкі падваявода Траян Корсак Бабыніцкі, які ўслед за Сапегамі наладзіў супрацоўніцтва з Фаміліяй і аказаўся на чале адной з прыхільных ёй шляхецкіх груповак у Полацкім ваяводстве [13, с. 136-137; 39, p. 3; 40, p. 12; 41, p. 7-8]. Такім чынам, замест супрацоўніцтва з Радзівіламі полацкі падваявода аддаў перавагу “старому саюзу” з Сапегамі. Траян Корсак Бабыніцкі на перадканвакацыйным сойміку дзейнічаў у інтарэсе Аляксандра Сапегі і пераслаў яму два лісты, якія даслалі яму іншыя магнаты (можна меркаваць, што адзін быў ад Караля Станіслава Радзівіла) з просьбамі дапамогі на гэтым сойміку. Траян Корсак Бабыніцкі няведаў як яму дзейнічаць з гэтымі просьбамі і прасіў рашэння Сапегі ў гэтай справе [42, p. 6v].

Згодна планам Фаміліі ў ВКЛ планавалася арганізаваць канфедэрацыі супраць дзейнасці Радзівілаў на Трыбунале ВКЛ. У Полацкім ваяводстве гэтая ідэя прывяла да канфлікту сярод шляхты. Рэгент канцылярыі ВКЛ Міхал Сяліцкі прэтэндаваў на выбар павятовым маршалкам і таму перадаў у канцылярыю ўніверсал са спазненнем толькі 5 чэрвеня 1764 г. Полацкі падваявода і маршалак каптуровага суда Траян Корсак Бабыніцкі скансультаваўшыся з прысутнымі ўраднікамі і шляхтай вызначыў тэрмін сойміка на 7 ліпеня 1764 г. У гэты дзень зноў успыхнуў канфлікт сярод полацкай шляхты. Прыхільнікі Траяна Корсака Бабыніцкага не хацелі дапусціць выбарам маршалкам канфедэрацыі Полацкага ваяводства Сяліцкага. У адказ той са сваімі прыхільнікамі вырашыў не ісці на соймік на замак і правесці альтэрнатыўны соймік у францішканаў. У выніку адбылося два соймікі і было створана две кан-

федэрацыі. У францішканаў маршалкам канфедэрацыі быў абраны рэгент канцылярыі ВКЛ Міхал Сяліцкі, а на замку пад дырэкцыяй міцунскага старосты Урбана Грабніцкага – балдычэўскі староста Фларыян Рыпіньскі. Сяліцкі абвінавачваў у спазненні ў стварэнні канфедэрацыі сваіх апанентаў, а тыя ў сваю чаргу рэгента канцылярыі ВКЛ. Траян Корсак Бабыніцкі актыўна ўдзельнічаў у гэтым канфлікце і падтрымліваў Фларыяна Рыпіньскага [13, с. 140-141; 42, р. 54-55; 43, арк. 1700-1701адв].

На канвакацыйным сойме было прынята рашэнне, што на элекцыйным сойме кожнае ваяводства мае прадстаўляць шэсць паслоў. Вядома інструкцыя з полацкага перадэлекцыйнага сойміка. На ім полацкая шляхта абрала пасламі на элекцыйны сойм: маркоўскага старосту Юстыніяна Шчыта, смаленскага гродскага пісара Яна Пакаша, полацкага падчашага Бенедыкта Кубліцкага, полацкага ротмістра Ігната Есмана, полацкага ротмістра і шмяльтынскага старосту Станіслава Гласку, полацкага мечніка Тадэвуша Спінка. Інструкцыю ім падпісала 34 шляхціцаў на чале з полацкім ротмістрам Янам Шантырам. Яна дае магчымасць рэканструіраваць групоўку, сярод лідараў якой былі полацкі стольнік Ян Буйніцкі, полацкі падваявода Траян Корсак Бабыніцкі, полацкі гродскі пісар Станіслаў Грабніцкі, полацкі ротмістр Урбан Грабніцкі, полацкі канюшы Казімір Пакаш, полацкі ротмістр Гіляры Корсак Бабыніцкі, полацкі ротмістр і каптуровы суддзя Ігнат Корсак Бабыніцкі [13, с. 142-143; 44, s. 7-21]. Як бачна, у групоўку, дзе Траян Корсак Бабыніцкі, увайшлі прадстаўнікі некалькіх уплывовых родаў Полацкага ваяводства: Грабніцкіх, Корсакаў, Пакашаў, Шчытоў. Прычым сярод гэтай групоўкі аказаліся не толькі прыхільнікі Сапегаў, але і адданыя прыхільнікі Фаміліі: полацкі стольнік Ян Буйніцкі і полацкі гродскі пісар Станіслаў Грабніцкі, што было дзіўна, бо іншы мясцовы лідар Фаміліі – рэгент канцылярыі ВКЛ Міхал Сяліцкі – узначаліў іншую групоўку. Безумоўна ўваход Корсакаў у гэтую групоўку быў заслугай Траяна Корсака Бабыніцкага.

Генеральная канфедэрацыя ВКЛ прызнала легітымнай канфедэрацыю Полацкага ваяводства Сяліцкіх і іх прыхільнікаў. У такой сітуацыі пакрыўджаны Траян Корсак Бабыніцкі вырашыў не ехаць на элекцыйны сойм. Асабліва падкрэсліваў, што не будзе прысутнічаць сам, як і значная колькасць яго прыхільнікаў. Іншай прычынай было тое, што Траян Корсак Бабыніцкі адмовіўся канкурыраваць аб выбары паслом, бо саступіў канкурэнцыі рэкамендаванаму Аляксандрам Сапегай Тадэвушу Спінку [42, р. 60]. Юзаф Сяліцкі не спыніўся на гэтай лакальнай перамозе. 9 жніўня 1764 г. ён падгаварыў пазваць з-за зробленыя крыўды на суд Генеральнай канфедэрацыі Траяна Корсака Бабыніцкага шляхціца Мыслінскага, які нібыта раней служыў у полацкага падваяводы. У выніку Траян Корсак Бабыніцкі быў вымушаны шукаць дапамогі ў Аляксандра Сапегі ў судах Генеральнай канфедэрацыі [42, р. 62-62v]. Траян Корсак Бабыніцкі ў сваю чаргу імкнуўся перашкодзіць прызнанню палкоўнікам Полацкага ваяводства Сяліцкага і стараўся ў Аляксандра Сапегі, каб легітымным палкоўнікам Полацкага ваяводства прызналі полацкага лоўчага Ігната Корсака Бабыніцкага [42, р. 61]. Дапамога Аляксандра Сапегі і іншых прыхільных магнатаў прынесла карысць Траяну Корсаку Бабыніцкаму і яго прыхільнікам. Генеральная канфедэрацыя ВКЛ змяніла сваё першапачатковае рашэнне і прызнала легітымнай канфедэрацыю праціўнікаў Сяліцкага. Гэта ўмацавала пазіцыі Траяна Корсака Бабыніцкага і яго прыхільнікаў.

На полацкім перадкаранацыйным сойміку 1764 г. Аляксандр Сапега хацеў, каб адным з паслоў быў абраны Траян Корсак Бабыніцкі. Аднак той захварэў і адмовіўся старацца аб пасольства. Сам соймік адбыўся пасля працяглых перамоў паміж варагуючых груповак, якія праходзілі некалькі дзён і іх праводзілі полацкі войскі Антоній Зяновіч і полацкі стольнік Ян Буйніцкі. У выніку пасламі на каранацыйны сойм 1764 г. былі абраны полацкі войскі Антоній Зяновіч і кушліцкі староста Юрый Корсак. Траян Корсак Бабыніцкі абяцаў, што абодва паслы будуць прыхільны інтарэсам полацкага ваяводы і польнага гетмана ВКЛ Аляксандра Сапегі, але асабліва рэкамендаваў свайго родзіча кушліцкага старосту [13, с. 144; 42, р. 65-65v].

Траян Корсак Бабыніцкі пільнаваў вынікі грамнічнага і элекцыйных соймікаў Полацкага ваяводства 1765 г. Іх удалося скончыць “з вялікай цяжкасцю і з працягненнем часу пасяджэнняў”. Траян Корсак Бабыніцкі праінфармаваў полацкага ваяводу Аляксандра Сапегу аб іх паспяховым заканчэнні і абранні полацкім падкаморыям Антонія Зяновіча; полацкім харужым – Ігната Корсака Бабыніцкага; полацкімі земскімі суддзямі – кушліцкага старосту Юрыю Корсака Бабыніцкага, полацкага земскага сурагатара Антонія Вінцэнта Пакаша, крашуцкага старосту Пятра Буйніцкага, полацкага ротмістра Ігната Есмана; полацкім земскім пісарам – полацкага гродскага суддзю Сымона Тадэвуша Пжысецкага. На вольны ўрад полацкага гродскага суддзі Траян Корсак Бабыніцкі схіляўся падтрымаць каго-небудзь з рода Рыпінскіх. Такім чынам, удалося б кампенсаваць тое, што ніхто з гэтага роду не атрымаў ніякіх выбарных земскіх урадаў. Калі Аляксандр Сапега не пагадзіўся б на іх кандыдатуру, то прасіў надаць урад полацкага гродскага суддзі аднаму з сваіх пляменнікаў: інфлянцкаму войскаму Яну Шантыру (напэўна інфлянцкі вайсковіч) ці полацкаму абознаму Тадэвушу Войне. Потым, аднак, перадумаў і прасіў надаць гэты ўрад бецкаму старосце Тадэвушу Пжысецкаму, які вельмі шмат яму дапамог падчас элекцыйных соймікаў [42, р. 50-50v, 65]. Ужо на наступны дзень, 12 лютага 1765 г., Траян Корсак Бабыніцкі змяніў сваю пазіцыю наконт урада полацкага гродскага суддзі і даслаў з лістом да полацкага

polotsk.su

ваяводы Аляксандра Сапегі свайго пляменніка Яна Шантыра. У гэтым лісце тлумачыў, што быў вымушаны рэкамендаваць на ўрад полацкага гродскага суддзі Тадэвуша Пжысецкага з-за "соймікавых інтарэсаў", якога вельмі моцна падтрымліваў уплывовы род Рыпінскіх. Насамрэч хацеў бы бачыць полацкім гродскім суддзёй не Пжысецкага, а аднаго з сваіх пляменікаў. Для ўзмацнення сваіх пазіцый як полацкага падваяводы прасіў Аляксандра Сапегу падтрымаць Шантыра ў стараннi аб урад полацкага войскага [42, p. 56-56v]. Аднак полацкі ваявода і польны гетман ВКЛ Аляксандр Сапега не прыслухаўся да просьб полацкага падваяводы. У выніку ўрад полацкага гродскага суддзі атрымаў Тадэвуш Пжысецкі. Напэўна, нічога не дала пратэкцыя Сапегі і ў караля Станіслава Аўгуста і ўрад полацкага войскага ўвогуле дастаўся хлявінскаму старосце Юзафу Сяліцкаму, сыну рэгента канцылярыі ВКЛ Міхала Сяліцкага, які быў палітычным апанентам Траяна Корсака Бабыніцкага. Такім чынам, размеркаванне ўрадаў у Полацкім ваяводстве ў 1765 г. неабходна прызнаць няўдалым для Траяна Корсака Бабыніцкага, бо яму не толькі не ўдалося ўзмацніць пазіцыі сваіх родзічаў, але ўрады дасталіся яго палітычным сапернікам. У той жа час размеркаванне ўрадаў трэба прызнаць удалым для рода Корсакаў, бо ім дасталіся ўрады полацкіх харужага і земскага суддзі.

У гэты час Траян Корсак Бабыніцкі быў вымушаны мірыцца з прысутнасцю значнай варожай групоўкі. У такой сітуацыі полацкія соймікі адбываліся на падставе кампрамісу. Так, 25 жніўня 1766 г. у Полацку разам з полацкім стольнікам Янам Буйніцкім Траян Корсак Бабыніцкі быў абраны паслом на сойм [45, арк. 967-967адв]. На гэтым сойме сярод іншага была прынята рашэнне аб дазволе выехаць за мяжу польнаму гетману ВКЛ і полацкаму ваяводзе Аляксандру Сапеге. На час адсутнасці полацкага ваяводы Траян Корсак Бабыніцкі прызначаўся выконваць абавязкі полацкага гродскага сурагатара [46, s. 497]. Фактычна Траян Корсак Бабыніцкі зноў атрымаў функцыі, якія выконваў да выбара полацкага ваяводы ў 1753 г. Гэта ўзмацніла і яго пазіцыі сярод полацкай шляхты.

Polotsk.su

Значна ўзмацніў свае пазіцыі ў Полацкім ваяводстве Траян Корсак у 1767 г., калі актыўна ўдзельнічаў у канфедэрацкім руху, які быў ініцыіраваны Расіяй і меў дамагчыся ўраўнавання ў правах "дысідэнтаў". 22 мая 1767 г. Траян Корсак Бабыніцкі быў абраны маршалкам канфедэрацыі Полацага ваяводства. Нельга казаць, што полацкі падваявода паступіў як прыхільнік Расіі, бо полацкая канфедэрацыя, як і большасць у ВКЛ, выступіла супраць ураўнання "дысідэнтаў" у правах з каталіцкай шляхтай [47, с. 107]. 2 чэрвеня 1767 г., калі была створана Генеральная канфедэрацыя ВКЛ, то Траян Корсак Бабыніцкі прадстаўляў у ёй канфедэрацыю Полацкага ваяводства [47, с. 112, 114, 123]. Паспяшаўся як мага хутчэй выканаць пастанову Генеральнай канфедэрацыі і вярнуць пад уладу Караля Станіслава Радзівіла, які вярнуўся з эміграцыі, Невельскае і Себежскае княствы. Аб чым падрабязна інфарміраваў Караля Станіслава Радзвівіла, імкнучыся аднавіць ранейшыя адносіны з ім [38, k.6-8, 9-11]. Траян Корсак Бабыніцкі як маршалак канфедэрацыі Полацкага ваяводства атрымаў універсал на скліканне перадсоймавага сойма, але фактычна блакіраваў яго скліканне – не інфармаваў шляхту і не рассылаў копіі ўніверсала па парафіях. У выніку расійскі пасол Мікалай Рапнін напісаў да полацкага ваяводы і польнага гетмана ВКЛ патрабаванне загадаць Корсаку распаўсюдзіць універсал, а калі гэта не адбудзецца, то абяцаў "ад расійскіх войскаў, хутка ў тоя ж ваяводства меўшых прыбыць, Яго Міласці пану падваяводзе Корсаку значныя нанесці крыўды" [48, арк. 196-197адв]. Невядома які ўплыў мелі пагрозы Рапніна і загад Аляксандра Сапегі. 24 жніўня 1767 г. Траян Корсак Бабыніцкі як маршалак канфедэрацыі быў дырэктарам полацкага пасольскага сойміка, дзе пасламі на сойм былі абраны інфлянцкі кашталяніц Іяхім Шчыт і інфлянцкі ротмістр Ян Шантыр. Прычым сам Траян Корсак Бабыніцкі заўважаў слабую прысутнасць шляхты на сойміку – "жыхары ваяводства засталіся па сваім дамам" [49, арк. 547-554адв]. На полацкім грамнічным сойміку 1768 г. Траян Корсак Бабыніцкі моцна стараўся аб выбары прыхільных дэпутатаў, якімі былі абраны смаленскі харужыц Ян Корсак і Рох Клепацкі. Праціўнікі Корсакаў толькі для "звычайнага нас ачарнення занеслі маніфесты" супраць выбара дэпутатаў. У такой сітуацыі Траян Корсак Бабыніцкі спадзяваўся на дапамогу віленскага ваяводы Караля Станіслава Радзівіла, што той не дасць перашкодзіць полацкім дэпутатам увайсці ў лік трыбунальскіх суддзяў [38, к. 14-15; 48, арк. 395-398адв]. Траян Корсак Бабыніцкі і яго прыхільнікі абвінавачвалі сваіх праціўнікаў, што яны правялі соймік не ў "соймікавай ізбе", а "прыватна ў сваім лагеры" [48, арк. 429-430адв]. Зусім паіншаму паказвае падзеі грамнічнага сойміка пратэстацыя апанентаў Траяна Корсака Бабыніцкага: полацкая шляхта дамовілася, што выбар дэпутатаў адбудзецца на падставе большасці галасоў ("крэскаваннем"). Аднак Траян Корсак Бабыніцкі парушыў дамову і са сваімі прыхільнікамі на замку спусціўся ў палац полацкага ваяводы, дзе ў адным з пакояў аб'явіў абранымі дэпутатамі Яна Корсака Бабыніцкага і Роха Кляпацкага. Праціўнікі полацкага падваяводы даслалі да яго паслоў гусарскага таварыша Казіміра Спінка, полацкага ротмістра Даміника Пжысецкага і полацкага ляснічага Бенедыкта Пжысецкага, запрашаючы прыбыць на соймік. У адказ Траян Корсак Бабыніцкі заявіў, што грамнічны соймік адбыўся і ўжо абраны дэпутаты. Гэта прымусіла апанентаў полацкага падваяводы правесці альтэрнатыўны соймік, дзе дэпутатамі былі абраны полацкі ротмістр Крыштаф Спінэк і Караль Рагожа. На карысць сапраўднасці інфармацыі праціўнікаў Траяна Корсака Бабыніцкага сведчыць, што іх пра-

тэстацыю падпісала значная колькасць уплывовых шляхціцаў і ўраднікаў Полацкага ваяводства: рэгент канцылярыі ВКЛ Міхал Сяліцкі, полацкі падкаморый Антоні Зяновіч, полацкі земскі суддзя Пётр Буйніцкі, полацкі войскі Юзаф Сяліцкі, полацкі стольнік Ян Буйніцкі, полацкі падчашы Бенедыкт Кубліцкі, полацкі чашнік Казімір Пжысецкі, полацкі гродскі суддзя Тадэвуш Пжысецкі, полацкі мечнік Сымон Тадэвуш Обрампальскі і яшчэ больш за 260 простых шляхціцаў [50, p. 7-10]. У той жа час крэдэнс дэпутатам абраных на полацкім сойміку пад кіраўніцтвам Траяна Корсака Бабыніцкага падпісала больш за 280 шляхціцаў на чале з самім полацкім падваяводай і маршалкам канфедэрацыі Полацкага ваяводства, кансыляжамі канфедэрацыі Полацкага ваяводства шмяльтынскім старостай Станіславам Гласко і балдынеўскім старостай Фларыянам Людвікам Рыпіньскім, а таксама полацкім крайчым Адамам Лянкевічам, полацкім скарбнікам Людвікам Корсакам і полацкім будаўнічым Міхалам Свалынскім. Найбольш подпісаў пакінулі прадстаўнікі родаў Корсакаў, Гласкаў і Снарскіх. Былі тут і шматгадовыя паплечнікі полацкага падваяводы, полацкія ротмістры Гіляры, Станіслаў і Ян Корсакі. Як бачна, прыхільнікі Траяна Корсака Бабыніцкага мелі нязначную колькасную перавагу, але сярод іх было мала ўраднікаў Полацкага ваяводства. Аднак на іх баку былі ўраднікі канфедэрацыі Полацкага ваяводства. На рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ за легітымны быў прызнаны соймік, якім кіраваў Траян Корсак Бабыніцкі і адпаведна дэпутаты з яго Ян Корсак і Рох Кляпацкі ўвайшлі ў лік трыбунальскіх суддзяў. Гэта быў безумоўны поспех Траяна Корсак Бабыніцкага над яго праціўнікамі ў Полацкім ваяводстве.

Тым больш нечаканым быў рэванш, які ўзялі яго апаненты на наступным полацкім грамнічным сойміку 1769 г., калі дэпутатамі былі абраны полацкі падстолі Юзаф Зяновіч і Сымон Буйніцкі [51, арк. 355, 357]. Аднак ужо ў 1770 г. полацкі грамнічны соймік адбываўся з яўнай перавагай Корсакаў і Траяна Корсака Бабыніцкага. Іншая справа, што непрыхільны Корсакам і прыхільны іх праціўнікам Пжысецкім, першы вышэйшы ўраднік полацкі, падкаморы Антоній Зяновіч, не даў магчымасці абіраць дэпутатаў большасцю галасоў (“крэскаваннем”), бо на баку Корсакаў было каля 300 шляхціцаў, а Пжысецкіх толькі каля 100 шляхціцаў. Таму соймік быў сарваны і Корсакі толькі маглі занесці пратэст супраць дзейнасці полацкага падкаморыя. Яго як раз і падпісала каля 300 шляхціцаў Полацкага ваяводства на чале з мясцовымі ўраднікамі: земскім суддзёй Ігнатам Есманам, падваяводай Траянам Корсакам Бабыніцкім, скарбнікам Людвікам Корсакам Бабыніцкім, крайчым Адамам Лянкевічам, мастаўнічым Рафалам Гласко. Больш за ўсё подпісаў паставілі прадстаўнікі рода Корсакаў, а сярод іх шматгадовыя паплечнікі полацкага падваяводы полацкія ротмістры Гіляры, Ян і Станіслаў Корсакі [52, с. 353; 53, арк. 503-506адв]. Полацкі грамнічны соймік 1771 г. зноў скончыўся перамогай шляхецкай групоўкі Корсакаў і полацкага падваяводы. Гэты соймік пачаў полацкі падкаморы Антоній Зяновіч. На другі дзень Антоні Зяновіч і полацкі земскі суддзя Антоній Вінцэнт Пакаш, убачыўшы перавагу шляхецкай групоўкі Корсакаў, адмовіліся ад кіравання соймікам і пакінулі месца яго правядзення. Астатняя шляхта абрала дырэктарам сойміка полацкага земскага суддзю Юрыя Корсака. Пад яго кіраўніцтвам дэпутатамі былі абраны полацкі крайчы Адам Лянкевіч і мазырскі чашніковіч Антоні Герцык. Крэдэнс Лянкевічу разам з дырэктарам сойміка падпісала каля 300 шляхціцаў разам з мясцовымі ўраднікамі: земскім суддзёй Ігнатам Есманам, земскім пісарам Сымонам Тадэвушам Пжысецкім, падваяводай Траянам Корсакам Бабыніцкім, гродскім суддзёй Адамам Свалынскім, абозным Станіславам Корсакам, канюшым Казімірам Пакашам, мастаўнічым Рафалам Гласко і вялікай колькасцю прадстаўнікоў рода Корсакаў разам з пастаяннымі паплечнікамі полацкага ваяводы полацкім абозным Станіславам Корсакам, полацкімі ротмістрамі Янам і Гілярым Корсакам. Чарговы раз можна казаць, што шляхецкая групоўка Корсакаў у гэты час магла мабілізаваць каля 300 шляхціцаў Полацкага ваяводства, а на яе чале аказаліся полацкі падваявода Траян Корсак Бабыніцкі і полацкі земскі суддзя Юры Корсак Бабыніцкі [54, арк. 440-443адв].

Траян Корсак Бабыніцкі прысутнічаў і на апошнім перад Першым падзелам Рэчы Паспалітай сойміку ў Полацку (4 мая 1772 г.), дзе падпісаў крэдэнс полацкім паслам да караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага [55, арк. 39адв]. Пасля Першага падзела Рэчы Паспалітай Траян Корсак Бабыніцкі быў прызначаны полацкім падваяводай ад пскоўскага губернатара, генерала-маёра расійскіх войск Міхаіла Крачэтнікава [55, арк. 83]. Ён нядоўга быў на гэтым урадзе, бо 10 сакавіка 1773 г. памёр у Полацку, куды прыбыў для ўдзелу ў выбарах дэлегата да расійскай імператрыцы, нечакана аслабеў і хутка памёр “паўсюдны не толькі ў сваім родзе, але ў цэлым Полацкім ваяводстве па сабе пакінуўшы смутак” [56, k. 1].

Такім чынам, Траян Корсак Бабыніцкі пражыў крыху больш за пяцьдзесят год, але зрабіў выдатную кар’еру для шляхціца Полацкага ваяводства. Па чарзе з 1749 г. ён займаў ключавыя ўрады для Полацкага ваяводства: полацкага гродскага сурагатара і полацкага падваяводы. Гэта значыць больш за дваццаць тры гады ў адсутнасць полацкага ваяводы кіраваў мясцовай адміністрацыяй. Траяну Корсаку Бабыніцкаму пасля смерці брата Фабіяна ўдалося аб’яднаць у сваіх руках усе спадчынныя ўладанні. У 1738 г. браты Фабіян і Траян Корсакі Бабыніцкія разам з вайпунскім старостай Міхалам Сяліцкім змянілі ранейшы саюз з родамі Корсакаў Удзельскіх і Жабаў і прымірыліся са шматгадовымі праціўнікамі Шчытамі і Буйніцкімі. У барацьбе магнацкіх груповак у ВКЛ Траян Корсак Бабыніцкі разам з братам выступілі на баку Сапегаў. Прыхільнікам Сапегаў Траян Корсак Бабыніцкі застаўся да канца свайго

жыцця. Дзякуючы Сапегам, у 1749 г. Траян Корсак Бабыніцкі атрымаў урад полацкага гродскага суратага. Адзячыў ён Сапегам у 1753 г., калі яго падтрымка дала магчымасць абраць полацкім ваяводай Аляксандра Сапегу. Траян Корсак Бабыніцкі за гэта атрымаў урад полацкага падваяводы і вярнуў ад Грабніцкіх за грашовую кампенсацыю ўладанні брата Фабіяна. З канца 50-х гг. XVIII ст. Траян Корсак Бабыніцкі стараўся супрацоўнічаць і з Радзівіламі, але толькі калі гэта не супярэчыла Сапегам. З сярэдзіны 40-х гг. XVIII ст. спачатку з братам, а пасля яго смерці ў 1752 г. асобна, Траян Корсак Бабыніцкі ўзначаліў шляхецкую групоўку Корсакаў. Яе кіраўніком ён заставаўся да канца свайго жыцця. Пад яго кіраўніцтвам Корсакі былі адной з дзвюх шляхецкіх груповак, якія змагаліся за дамініраванне ў Полацкім ваяводстве. Іх праціўнікі ўвесь час мяняліся, імі былі Грабніцкія, Буйніцкія, Сяліцкія, а Корсакі ўвесь час захоўвалі статус аднаго з двух лідэраў сярод шляхецкіх груповак Полацкага ваяводства. Пад яго кіраўніцтвам Корсакам удалося ўмацаваць свае пазіцыі сярод шляхты Полацкага ваяводства, калі ў 1765 г. прадстаўнікі іх групоўкі атрымалі ўрады полацкага харужага і полацкага земскага суддзі. Аднак не ўдалося атрымаць урадаў для пляменнікаў Траяна Корсака Бабыніцкага: Яна Шантыра і Тадэвуша Войны. Урад маршалка канфедэрацыі Полацкага ваяводства 1767 г. не прынёс славы Траяну Корсаку Бабыніцкаму, але забяспечыў перавагу групоўкі Корсакаў на полацкіх сойміках у 1767 – 1768 гг. У гэты час пад кіраўніцтвам Сяліцкіх і Зяновічаў супраць Корсакаў аб’ядналася значная групоўка полацкай шляхты. Аднак пад умелым кіраўніцтвам Траяна Корсака Бабыніцкага Корсакі перамаглі іх на полацкіх сойміках у 1767–1768 і 1770–1771 гг. з 300 шляхціцамі. Пасля Першага падзелу Рэчы Паспалітай Траян Корсак Бабыніцкі быў прызначаны полацкім падваяводай новай расійскай адміністрацыяй. Сімвалічна, што памёр Траян Корсак Бабыніцкі перад першым соймікам пасля Першага падзелу Рэчы Паспалітай, калі полацкая шляхта мела абраць паслоў да расійскай імператрыцы Кацярыны II. Такім чынам, застаўся ўдзельнікам полацкіх соймікаў толькі Рэчы Паспалітай.

ЛІТАРАТУРА

1. Bonecki, A. Herbarz polski / A. Boniecki. – Warszawa, 1907. – T. 11 : Komorowscy – Kotowski. – S. 186.
2. Żychliński, T. Złota księga szlachty polskiej / T. Żychliński. – R. 4. – S. 367.
3. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Publiczne Potockich. – Sygn. 71.
4. Мацук А. Род Буйніцкіх у Полацкім ваяводстве ў панаванне Аўгуста ІІІ / А. Мацук // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў (да 20-годдзя археалагічных і этнаграфічных экспедыцый ПДУ). – Наваполацк, 2014. – Ч. 2. – С. 107–116.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 25.
6. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1025. B. 24.
7. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 478.
8. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1025. B. 21.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 29.
10. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 15669.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 26.
12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1823. Воп. 1. Спр. 22.
13. Мацук, А. Полацкае ваяводства ў XVIII ст.: ваявода, шляхецкая эліта, соймікі / А. Мацук. – Мінск, 2014.
14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 27.
15. VUB. – F. 4. B. 35780.
16. Мацук, А. Адносіны магнатаў і шляхты да выбараў полацкага ваяводы / А.Мацук // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы V міжнар. канф, Полацк, 2009. – С. 120–128.
17. Biblioteka PAU PAN. – Sygn. 5999.
18. Российский государственный исторический архив. – Ф. 1343. Оп. 23. Д. 7170.
19. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 34.
20. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 35.
21. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 36.
22. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Sygn. 13858. Cz. 1.
23. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. Op. 14. B. 2.
24. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 497.
25. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 499.
26. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Sygn. 1627.
27. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Sygn. 17702. Cz.2.
28. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Sygn. 2152.
29. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Sygn. 13085.
30. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 41.
31. Macukas, A. Oginskių giminės Breslaujos šaka XVIII amžiuje / A. Macukas // Kunigaikščiai Oginskiai Lietuvos istorijoje : kultūrinės veiklos pėdsakais. [D.] 2 : mokslo straipsnių rinkinys / sudarytoja Ramunė Šmigelskytė-Stukienė. – Vilnius, 2015. – S. 87–103.
32. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 112.
33. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 116.



PolotskSU

34. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. OP. 1. B. 2559.
35. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. OP. 1. B. 4517.
36. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1025. B. 35.
37. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1823. Воп. 1. Спр. 32.
38. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Sygn. 7308.
39. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. OP. 1. B. 4476.
40. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. OP. 1. B. 4110.
41. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Sygn. 14679.
42. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. OP. 1. B. 2206.
43. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 54.
44. Rubon. – Wilno, 1847. – T. VIII. – S. 7–21.
45. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 55.
46. Volumina Legum. – Petersburg, 1860. – T. VII.
47. Анішчанка, Я. Інкарапарацыя. Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай / Я. Анішчанка. – Мінск, 2003.
48. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 57.
49. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 56.
50. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1025. B. 12.
51. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 58.
52. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, тздаваемый при управлении Виленского учебного округа. – Вильно, 1874. – Т. X.
53. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 60.
54. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 62.
55. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 63.
56. Gazety Wileńskie. – 1773. – XIII. – 27 Marca.

## POLITICAL ACTIVITY OF TRAJAN IN KORSAK BABINSKOGO THE RULE OF AUGUST III AND STANISLAW AUGUST PONIATOWSKI

***A. MATSUK***

*Trojan Korsak Babinski has made a significant contribution to the history of Palacina. He has had a great career and 1749. held key government for province of Polotsk: Polotsk and Polotsk grodskogo surgicare padmavati. The Trojan Korsak Babinska managed to unite in his hands all the hereditary possessions. Successful was his public and political activity, where since the mid 40-ies of the XVIII century Trojan Korsak Babinski headed gentry grouping Korsakov.*

PolotskSU